*Берастоўскі А.В.*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі, Мінск*
*Берастоўская М.В.*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск*

# ПЕРАВАГІ І НЕДАХОПЫ ВЫКАРЫСТАННЯ ІКТ У РОЗНЫХ ВІДАХ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ НА ПРЫКЛАДЗЕ ВЫКЛАДАННЯ ЗАМЕЖНЫХ МОЎ Ў БДУ І БДУІР

Як справядліва адзначалі нашы калегі: “Тэсціраванне становіцца адным з галоўных элементаў кантролю ў сістэме сучаснага навучання замежнай мове … Пры правільнай падрыхтоўцы і ўкараненні тэсціраванне, несумненна, робіцца важным інструментам, які служыць для праверкі эфектыўнасці кожнага этапу працэсу навучання” [2, с. 207]. Пры гэтым на сучасным этапе ўзрастае значэнне выкарыстання інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій (ІКТ) у навучальным працэсе. Падчас пандэміі COVID-19 у 2020—2022 гг. асабліва ўзрос попыт на выкарыстанне ІКТ у навучанні і кантролі ведаў дыстанцыйна.

У БДУІР і БДУ ў адказ на запыт на дыстанцыйнае навучанне пачалі выкарыстоўваць сістэму Moodle з платформай відэасувязі BigblueButton, пра перавагі і недахопы якой мы пісалі раней [1, с. 366], і іншымі элементамі. Нават пасля вяртання да аўдыторнай работы як асноўнай Moodle застаўся важным рэсурсам дадатковай інфармацыі і элементаў кантролю. У прыватнасці, супрацоўнікі кафедры замежных моў БДУІР перапрацавалі версію прамежкавага кантролю лексіка-граматычных ведаў па чатырох модулях навучання з папяровай формы ў інтэрактыўныя тэсты. Калі ў 2020—2021 гг. групы часта зыходзілі на самаізаляцыю, то такія тэсты былі адзінай надзейнай магчымасцю

правесці прамежкавы кантроль з максімальным ахопам навучэнцаў. На цяперашнім этапе гэтыя інтэрактыўныя тэсты па-ранейшаму выкарыстоўваюцца, дзякуючы перавагам, якія яны даюць: зніжэнне ўплыву міжасабовых адносін паміж выкладчыкам і студэнтам (напрыклад, фаварытызм) на атрыманую адзнаку, аўтаматычная праверка вынікаў і выстаўленне адзнакі ў сістэму (што дае магчымасць выкладчыку эфектыўней карыстацца часам). Да пераваг можна аднесці і максімальны ахоп студэнтаў кантролем, бо дадзеныя тэсты можна выконваць дыстанцыйна, але абмежаваны час на выкананне зніжае верагоднасць выкарыстання студэнтам непрадугледжанай дапамогі. Да недахопаў адносіцца неабходнасць карыстацца інтэрнэтам, што прыводзіла да асобных выпадкаў збояў у выкананні тэсту пры слабым сігнале мабільнага інтэрнэта ў прыладах некаторых студэнтаў ці ў пэўных вучэбных памяшканнях. Пры гэтым абмежаванні трафіка мабільнага інтэрнэта прыладаў у асобных навучэнцаў не з'яўляюцца праблемай у цяперашні час, бо заўсёды ёсць студэнты з безлімітным мабільным інтэрнэтам і магчымасцю падзяліцца ім праз Wi-Fi.

Пілотны праект па распрацоўцы аналагічных інтэрактыўных заданняў бягучага, прамежкавага і выніковага кантролю для студэнтаў дыстанцынай формы навучання ў БДУІР выявіў яшчэ некалькі выклікаў для сістэмы Moodle. Матэрыялы, прадугледжаныя для абмеркавання ў групе, могуць не падыходзіць для інтэрактыўных тэстаў, дзе патрабуецца пэўны стандартны правільны адказ, што азначае поўную перапрацоўку заданняў. Таксама могуць здарацца збоі ў праграмным забеспячэнні сістэмы, што выяўлялася ў немагчымасці выбраць правільны адказ альбо ў памылковым ацэньванні вынікаў у Moodle.

У сістэме Moodle БДУ пры выкладанні французскай мовы студэнтам юрыдычных спецыяльнасцяў выкарыстоўваюцца інтэрактыўныя тэсты з функцыяй кантролю і навучання. Пераважна гэта

дасягаецца праз каментарыі, якімі стваральнікі суправаджаюць тэст. Калі навучэнец робіць памылку, а сістэма падлічвае вынікі, каментарыі дапамагаюць яму ўбачыць, чаму менавіта выбраны адказ няправільны.

Акрамя Moodle на нашых занятках у розных формах кантролю выкарыстоўваюцца пабочныя рэсурсы, сярод якіх сайты www.en.islcollective.com, www.englishpage.com. Але ў адрозненне ад Moodle тэсты на такіх рэсурсах зроблены не для выканнання ў рамках пэўнай вучэбнай праграмы, як і іншыя ІКТ гэтыя рэсурсы даступны толькі пры наяўнасці інтэрнэт-сувязі. У асобных выпадках магчыма змена праграмнага кода несумленнымі студэнтамі для «накручвання» вынікаў тэсту на сваю карысць.

Усе выклікі і недахопы выкарыстання ІКТ для ажыццяўлення кантролю ведаў не адмяняюць вышэй адзначаныя перавагі і магчымасці, таму неабходна далей вывучаць гэта пытанне для павышэння эфектыўнасці выкарыстання ІКТ у розных формах кантролю.

## Літаратура

1. Берастоўская, М.В. Параўнанне папулярных сродкаў відэасувязі ў выкладанні замежных моў студэнтам немоўных спецыяльнасцяў на прыкладах БДУ і БДУІР / М. В. Берастоўская, А. В. Берастоўскі, С. В. Завалокін // Современные средства связи : материалы XXVI Междунар. науч.-техн. конф., Минск, 21—22 окт. 2021 г. / Белорусская государственная академия связи ; редкол.: А. О. Зеневич [и др.]. — Минск, 2021. — С. 366.

2. Перевышко, А.И. Тестирование как основной метод контроля в современном языковом образовании/ А. И. Перевышко, Е. В. Юшкевич // Проблемы лингвообразования в неязыковом вузе: материалы VI Республиканской научно-практической конференции (с международным

участием), Минск, 10-11 марта 2022 г., / БГУ, Каф. английского языка естественных факультетов ФСК ; редкол.: А. Э. Черенда (отв. ред.) [и др.]. — Минск : БГУ, 2022. — С. 207—211.